

НАВОШТА ПАТРЭБЕН АНКАПСІХОЛАГ? 7

МАШТАБНАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА ПА КРАЯЗНАЎСТВЕ 8




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родной мове

# ЗВЯЗДА

3 САКАВІКА 2020 г. АЎТОРАК № 42 (29156)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый КАРАЕЎ, міністр унутраных спраў:**

*«Збыт і распаўсюджванне наркотыкаў сёння адбываюцца ў асноўным у інтэрнэце. Таму наша ўпраўленне па барацьбе з наркотыкамі ва ўзаемадзеянні з Аператыўна-аналітычным цэнтрам пры Прэзідэнце і Паркам высокіх тэхналогій узмоцнена займаецца інтэрнэт-разведкай. У гэтым мы дамагліся немалых поспехаў. Спыніць дзейнасць сумнеўных інтэрнэт-рэсурсаў мы не заўсёды ў стане, але доступ да іх спыніць можам».*

# «РОБАКРОК» — ГЭТА НЕ ГУЛЬНЯ




Яно і праўда — не гульня. Так называецца гурток робататэхнікі, у якім пад кіраўніцтвам настаўніцы інфарматыкі і матэматыкі Наталлі ЗНАК займаюцца малодшыя вучні 14-й сталічнай гімназіі. Дзеці вучацца ствараць рухомыя мадэлі, адна з якіх, магчыма, праз колькі гадоў стане прататыпам для новага вынаходства.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **У чатырох раёнах Магілёўскай вобласці пачалася пасяўная.**
- «Белпошта» прапануе бясплатна адправіць паштоўку да 8 Сакавіка.
- **Продаж кветак да 8 Сакавіка: ІП рэгістраваць не трэба, а толькі заплаціць адзіны падатак.**



- Сярэдні кошт 1 квадратнага метра жылля на другасным рынку Мінска складае $ 1,3 тысячы.
- **Методыку распрацоўкі лекаў ад каранавіруса прапануюць фіналісты «100 ідэй для Беларусі».**
- Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту ў студзені склаў Br0,9 млрд.
- **Школа батлейкі пачала працаваць у Гродзенскім раёне.**
- ЕС павысіў рызыку захворвання на каранавірус з сярэдняга да высокага ўзроўню.

Камунальныя стасункі

# ПРА ЖАДАННЕ ЗАВАЁЎВАЦЬ КОСМАС

**Як у Мінскім раёне вырашаюць праблему з якасцю вады**

**У беларускіх падземных водаў ёсць адзін істотны недахоп — павышаная колькасць жалеза. Жорсткасць, марганец і нават нітраты — не выключэнне. Сучасныя тэхналогіі з лёгкасцю дапамагаюць ад гэтага пазбавіцца, але і каштуюць немалых грошай. І не кожная мясцовая ўлада імкнецца «ахвяраваць» іх водаканалам дзеля рашэння такіх важных праблем. Але ў нашай гісторыі ўсё наадварот. Гэта гісторыя пра тое, калі ўсё склалася найлепшым чынам, гісторыя аб прафесіяналізме, вечным пошуку і жаданні працаваць. Тая гісторыя, якую хочацца ставіць у прыклад астатнім.**

СТАР. 4



Фота Валерыя КІСЛАЙ.

Прырода і мы

# ГЛАБАЛЬНАЕ ЗМЯНЕННЕ КЛІМАТУ

Пакуль сіноптыкі спрачаюцца, ці ёсць яно насамрэч, у нас знікла зіма. Ці надоўга?

**Сярэдняя тэмпература зімы 2019—2020 гадоў у нашай краіне склала плюс 1,5 градуса. Гэта на 5,5 градуса вышэй за кліматычную норму. Як адзначае намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана КУЗЬМІЧ, такая цёплая зіма на тэрыторыі Беларусі адзначаецца ўпершыню за ўвесь час інструментальных нацыянальных назіранняў (а вядуцца яны ўжо 140 гадоў).**

Згодна з нацыянальнай нормай тэмпературы ў халодны перыяд, кліматычная зіма на тэрыторыі нашай краіны так і не надышла. Ва ўсе зімовыя месяцы так і не адбыўся пераход сярэдняй тэмпературы праз нуль у бок паніжэння. На гэты раз мы атрымалі сярэднееўрапейскую зіму, якая адзначаецца плюсавымі тэмпературамі, змешанымі ападкамі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, а таксама поўнай адсутнасцю снежнага покрыва.

### ЦІ НЕ САМЫ ЦЁПЛЫ ГОД

Ва ўсе месяцы (акрамя студзеня і ліпеня) мінулага года ў Беларусі назіраліся станоўчыя тэмпературныя анамаліі. Тут жа спецыяліст адзначыла: сярэднегадавая тэмпература склала плюс 8,8 градуса, пры норме плюс 6,7 градуса. Перавышэнне на больш чым у два градусы лічыцца істотнай анамаліяй. На нашай планеце гэта быў амаль самы цёплы год. Цяплей было толькі ў 2016-м.

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X